Н.С. З клопатам пра песні народа. Мн., 1970; Р о м а н о в Ю.С. Жизнь и научная деятельность В.Н.Добровольского // Материалы по изучению Смоленской области. Мн., 1970. Вып. 7; Т р о ф и м о в И.Т. Писатели Смоленщины. М., 1973; А к у н ь к о в а А.М. [Хрушчова А.]. Жыццё і навукова-педагагічная дзейнасць У.М.Дабравольскага // Этнаграфічны зборнік. Мн., 1975; Я е ж. Беларуская казка ў запісах У.М.Дабравольскага // Беларуская фальклярыстыка. Мн., 1980; Х р у ш ч о в а А.М. У.М.Дабравольскі // Беларуская фальклярыстыка: Збіранне і даслед. нар. творчасці ў 60-х гг. XIX — пач. XX ст. Мн., 1989.

*І. У. Саламевіч.*

**ДАБРАХО́ЧЫ**, лясны бажок. Рост яго залежыць ад вышыні дрэў, вакол якіх ён ходзіць. Уяўляўся не злым духам, як інш. міфічныя насельнікі лесу, а апекуном пачцівых людзей. Але, як справядлівы суддзя, ён караў толькі вінаватага, насылаючы на яго пакутлівыя хваробы, з-за чаго той паміраў у страшэнных пакутах. Пэўныя шчаслівцы, казалі, могуць адратаваць няшчаснага, улагодзіўшы Д. ахвярамі — акрайцам хлеба і шчопцямі солі, загорнутымі ў чысты шматок. Такі чалавек разам з пакутнікам ідзе ў лес, дзе, памаліўшыся над ахвяраю, пакідае яе разам з хваробаю, а пакараны чалавек вяртаецца назад здаровы. На таго чалавека, які першы ступіў у яго след, Д. мог наслаць кару, прымусіўшы яго блукаць па лесе дацямна. Сяляне, забавіўшыся ў карчме, ці так цягаючыся, апраўдваліся перад панам тым, што Д. трымаў іх у лесе, і пры гэтым расказвалі пра дзіўныя здарэнні.

*Літ.*: C z a r n o w s k a M. Zabytki mifologii slowiańskiej w zwyczajach wiejskiego ludu na Białej Rusi dochowywane. (Gub. Mogilewska) // Dziennik Wileński. 1817. T. 6, №34.

*У. А. Васілевіч.*

**ДАВЕ́ДКІ**, перадвясельны абрад. Лакальныя назвы: «выведы», «допыты», «пярэпыты». Перад *Сватаннем*, каб быць упэўненым у згодзе дзяўчыны і яе бацькоў прыняць сватоў, бацькі хлопца пасылалі да дзяўчыны з хлебам і соллю старую сваячку або каго-небудзь з іншых блізкіх пажылых людзей; часам адпраўляліся маці або сам хлопец. Д. рабіліся патаемна, каб у выпадку адмовы дзяўчыны пра гэта ніхто не ведаў і не кпіў з хлопца. У Д. маглі ехаць і сваты, але без гарэлкі і падарункаў. Д. характарызаваліся галоўным чынам бытавымі звычаямі, абрадавыя элементы ў іх прадстаўлены слаба і праяўляліся ў абмене хлебам, у асобных умоўных формулах алегарычнага характару.

*Л. А. Малаш.*

**ДАВЫД-ГАРАДО́ЦКІ НАРО́ДНЫ ФАЛЬКЛО́РНЫ ГУРТ «КО́НІКІ»** г а р а д с к о г а Д о м а к у л ь т у р ы С т о л і н с к а г а р а ё н а. Заснаваны ў 1986, з 1991 народны. Кіраўнік — М.Вайцяховіч. Фалькл. праграмы калектыву, створаныя на аснове мясцовай традыцыі Шчодрыка, уяўляюць сабой унікальныя тэатралізаваныя абрадавыя прадстаўленні з удзелам шматлікіх фалькл. гуртоў мястэчка: «Коніка» суправаджаюць спевакі, музыкі, механоша, персанажы нар. тэатра. У час абраду выконваюцца шчадроўкі: «Ой, там пад шчадром Васілька з канём», «Там стаяла сасна», «Да запеймо песню слаўному пану», «Што на Дунаёчку», «Адкрывайце дзверы, коб було відно», «А ў бога, бога волы рогаты». Сярод іншых тэатралізаваных абрадаў — «Макавей», «Варвары», кірмашовыя «Семянушкі», перадвясельны «Выкуп пасцелі» і інш. У рэпертуары таксама лірычныя («Ой, чаго ж ты не прыйшоў», «А ў майго батэнька», «Ой, воля мая, воля», «Ой, хмелю мой, хмелю») і бяседныя («Чаравічкі мае, наскі выстрачаны», «Чарачка, мерачка не прастая» і інш.) песні, балады, танцы і інш. Выступаюць у касцюмах, выкананых у мясцовай традыцыі. Калектыў — удзельнік фестываляў фалькл. мастацтва ў Польшчы (г. Бяла-Падляска, 1990), «Дружбы народаў» у Таджыкістане (Душанбе, 1991), славянскіх народаў «Каляда» на Украіне (г.Роўна, 1997). Выступаў у фалькл. тэлепраграме «Запрашаем на вячоркі».

*В. Дз. Ліцьвінка.*

**ДАЖБО́Г**, адзін з багоў усходніх славян. У «Аповесці мінулых гадоў» паведамляецца, што калі князь Уладзімір паставіў ідалаў «на хълме въне двора теремьнаго» (каля 980), то там акрамя выяваў *Перуна*, Хорса, *Стрыбога*, Семаргла, *Мокшы* прысутнічаў ідал Д. Ва ўстаўцы ў перакладзе ўрыўка з «Хронікі Іаана Малалы», што знаходзілася ў Іпацьеўскім летапісе пад 1144, згадвалася: «По умрьтвии же Феостовъ егож и Сварога наричить и царствова сынь его именем Солнце: егож наричають Дажьбогъ. Солнце же царь сын Сварговъ еже есть Даждьбог». З гэтага вынікае, што Д. з'яўляўся богам *Сонца* і лічыўся сынам *Сварога*. У старажыт-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ